ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1988 г.
ЧАЦВЕР
12
МАЯ
№ 16 (1574)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## У наступным нумары чытайце

Пытанні сыпаліся, нібы гарох:

— Дзе шары для ўпрыгожання залы?

— Як там з музычным афармленнем?

Галя толькі паспявала адказваць. Цікава было назіраць за ёю збоку: здавалася, адкуль столькі энергіі ў гэтай звычайнай дзяўчыны? А яшчэ цярпення. Рабіла яна ўсё без злосці і мітусні, з радасцю.

— Для сябе ж стараемся,— заўважыла Галя,— для сваіх таварышаў. Дні факультэта — гэта асаблівае свята. І мы хацелі, каб яно сапраўды запомнілася, асабліва нашым малодшым таварышам.

Хачу толькі дадаць, што калі за мерапрыемства адказвае Г. Дабрынская, яно абавязкова запомніцца. Такая ў яе ўжо натура: рабіць абы з рук не можа.

Гаворачы пра камсамольскага лідэра, мы абавязкова заўважаем: фармальны ці нефармальны. Галіна Дабрынская, сакратар камітэта камсамола геафака, пераканалася: быць нефармальным лідэрам значна цяжэй, чым фармальным. А як, калі той і другі ў адной асобе? Адказ на гэта пытанне вы атрымаеце, калі прачытаеце матэрыял пра справы і клопаты камсамольскага сакратара Г. Дабрынскай, які знойдзеце ў наступным нумары.

## Беларускі універсітэт ТЭЛЕТАЙП *Учора • Сёння • Заўтра*

### СУР'ЁЗНАЯ РАЗМОВА

аб ролі навукова-даследчых падраздзяленняў і кафедраў універсітэта ў рашэнні важнейшых народнагаспадарчых праблем рэспублікі ішла на пасяджэнні партыйнага камітэта. У сваім дакладзе прарэктар па навуковай рабоце прафесар С. С. Шушкевіч расказаў прысутным аб дасягненнях універсітэцкай навукі.

Д. ВІЛЬКІН.

### ПАЛІТЫЧНЫ ВЕЧАР

лівійскіх студэнтаў, якія вучацца ў Мінску, «Лівія змагаецца, Лівія жыве» сабраў шмат удзельнікаў, тых, для каго лёс краіны — яго лёс. У клубе «Палітыкус», дзе праводзілася мерапрыемства, была арганізавана выстаўка аб Лівіі.

А. МАРОЗАЎ.

### САМЫЯ ДУЖЫЯ І СПРЫТНЫЯ

прынялі ўдзел у першынстве БДУ па гіраваму спорту. Пры падвядзенні вынікаў першае месца аддадзена юрфаку, другое — мехмату, трэцяе — геафаку. У асабістым першынстве пераможцамі ў розных вагавых катэгорыях сталі супрацоўнік Д. Рабцэвіч, студэнты У. Квочын (ФПМ), В. Лянгнер (мехмат), В. Харанека (факультэт радыёфізікі і электронікі), А. Дабранаў (юрфак).

З. МІХНЕВІЧ.



Я ВЕДАЮ ЯГО яшчэ са школы. Памятаю, як у мясцовай раёнцы пачалі з'яўляцца цікавыя публікацыі школьніка аб рэдкіх птушках Палесся.

Аднойчы, атрымаўшы часопіс «Родная прырода» з артыкулам па матэрыялах «Чырвонай кнігі», ён усхваляваўся не на жарт. Горкія факты сведчылі: згінуць птушкі — не будзе жыцця. Так нельга. Патрэбна змагацца за ўсё жывое. І Коля Чэркас пачаў шукаць на тэрыторыі свайго раёна гнёзды чорных буслоў. Доўга блукаў па імхах і дрыгве. І атрымаў першую перамогу — за два гады знайшоў пяцьдзесят гнёздаў гэтай рэдкай і на дзіва прыгожай птушкі. Іх абараняў.

Таму з першых гадоў вучобы на біяфаку пачаў вывучаць драпежных птушак. Арлана-белахвоста — самую вялікую птушку ў Беларусі, Коля шукаў два гады.

У лютым гэтага года запрасілі Мікалая ў Кіеў на Усесаюзную навуковую канферэнцыю. Там і даведаўся аб забавах 23 тысяч паляўнічых у невялікай даліне сярод Каўказскіх гор, у час якіх гінуць рэдкія птушкі. Пачуў і аб знішчэнні ў Турцыі 152 тысяч птушак, мяса якіх ідзе на кансервы, пер'е — на коўдры і падушкі. Карціна жахлівая. Спакойна расказваць пра ўсё гэта будучы арнітолаг Мікалай Чэркас не можа.

Пералічваючы ўсе яго падарожжы за практычным матэрыялам для курсавых работ, прыгадваючы ўсхваляваныя вочы і здзіўляючыся разнастайнасці яго захапленняў, часам жартую:

— Коля, цябе патрэбна ў «Чырвоную кнігу» занесці.

— Яна была б чырвонай толькі ад сораму.

— За нас, што мы цябе ў яе запісалі?

— За тое, што такая кніга наогул існуе.

Т. ХАМІЦЭВІЧ.

## «Далей, далей, далей...»

У цэнтры ўвагі многіх размоў і дыскусій знаходзіцца сёння п'еса М. Шатрова «Далей, далей, далей...». Адны адзначаюць яе мастацкія якасці і наватарства, другія — крытыкуюць. Шмат размоў наконт гэтага твора вядзецца і сярод студэнцтва. А каб былі яны больш прадметнымі і карыснымі, пашыралі кругагляд, супрацоўнікі аддзела масавай работы бібліятэкі БДУ вырашылі правесці на некаторых факультэтах дыскусіі.

Форма дыскусіі была выбрана незвычайная — палітсуды. На іх назначаліся суддзя, пракурор, адвакат і сведкі. Кожны павінен быў іграць сваю ролю. Імправізаваныя суды былі праведзены над меншавікамі і эсэрамі, над Троцкім, Каменевым, Зіноўевым, над контррэвалюцыянерамі і г. д. Пераканана, яны прынеслі студэнтам шмат карысці, бо перад кожным з іх удзельнікі знаёміліся з дадатковай літаратурай аб жыцці і дзейнасці таго ці іншага палітычнага дзеяча.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

## НА ПРОВАДЗЕ — «ПІРАТЫ»

ЗДЫМАЛАСЯ тэлефонная трубка, набіраўся чарговы нумар. Першая лічба, трэцяя, восьмая...

— Хіба ж угледзіш, колькі яны набіраюць,— паскардзілася старэнькая бабуля на вахце.— Прыходзяць, гавораць, хто ведае: з Мінскам ці па міжгародняму?!

І зноў здымалі трубку. І так 7943 разы на суму 6365 рублёў. За два месяцы і адзін тыдзень з 16 снежня 1987 года па 25 лютага гэтага года. Ім адказвалі Магілёў, Віцебск, Салігорск, Гомель, Брэст, Вільнюс, Кіеў, Казань, Ерэван, Алма-Ата, Масква, Калуга, Варонеж, Гродна, дзе, пэўна, не маглі ведаць аб існаванні загаду № 362-Л ад 29.09.83 «Аб арганізацыі і правілах вядзення міжгародніх тэлефонных размоў», падпісанага рэктарам універсітэта.

АЛЕ Ж, НА МАЮ ДУМКУ, не мог не пацікавіцца субяседнік аднаго з супрацоўнікаў кафедры неарганічнай хіміі (яго асоба да гэтай пары застаецца невядомай), які па нявызначаных пытаннях правадзіў 22 снежня і 4 студзеня працяглыя (амаль па паўгадзіны) перагаворы з Рыгай, адкуль бяруцца грошы на іх. Не ўпэўнена, што на другім канцы провада дачакаліся выразнага адказу. Таму паспрабую даць дакладную даведку. Дакументы — рэч пераканаўчая. Ім слова.

З ЗАГАДУ № 362-Л. «Дэканам факультэтаў і кіраўнікам іншых структурных падраздзяленняў міжгароднія тэлефонныя размовы весці толькі са спецыяльна выдзеленых тэлефонных апаратаў і строга абмежаванай колькасцю супрацоўнікаў».

Кіраўнікам структурных падраздзяленняў гэты ж дакумент прапанаваў арганізаваць неабходны ўлік і кантроль за выкананнем правілаў вядзення тэлефонных перагавораў. Здаецца, не так ужо і складана завесці спецыяльны журнал рэгістрацыі перагавораў, прызначыць асобу, адказную за правільнасць вядзення яго, і потым самім выключыць магчымасць вядзення міжгародніх тэлефонных перагавораў асобамі, якім гэта не дазволена. Здаецца... Толькі так не думаюць на кафедры педагогікі, у камітэце камсамола універсітэта, студэнцкім клубе, дэканаце геафака, на кафедры агульнай фізікі, у гаражы, дзе, дарэчы, не дазволена вядзенне міжгародніх тэлефонных перагавораў.

Дамовімся выключаць выпадкі, калі па справах патрэбна. Разглядаем толькі тыя размовы, што адбываюцца пасля таго, як стрэлкі гадзінніка пакажуць 18.00, і вядуцца не хвіліну, а многа больш.

А што ж адкажуць тыя, каго можна абвінаваціць, ледзь зірнуўшы на лічбы?

З ТЛУМАЧАЛЬНЫХ ЗАПІСАК.

«Тэлефон № 20-67-56, што ўстаноўлены на кафедры радыяцыйнай хіміі, з'яўляецца спараным з тэлефонам кафедры замежных моў, што перашкаджае ажыццяўленню кантролю. Я. П. Пятроў».

«Афіцыйна тэлефон № 77-29-10 лічыцца за кафедрай агульнай экалогіі, але радыёстанцыя факультэта радыёфізікі і электронікі самастойна падключылася да гэтага нумару. Звярталіся на тэлефонную станцыю з просьбай адключыць тэлефон, які спараны. Гэта не зроблена. Н. М. Кручкова».

«Указаныя парушэнні больш за ўсё дапускаюць асобы, якія атрымалі права на карыстанне міжгароднімі тэлефонамі, з іншых кафедраў. В. В. Грузінскі».

«Даводжу да вашага ведама, што з тэлефоннага апарата ў маім кабінеце міжгародніх званкоў не было. Т. М. Атрохава».

Вось вам і «фундаментальныя» тлумачэнні. Сусед ківае на суседа. Існаванне паралельных тэлефонаў гэта дазваляе.

Між іншым і ў новым загадзе № 203-К ад 13 красавіка 1988 года гэтай праблеме не прысвечана ніводнага слова.

— А што б зрабілі вы на маім месцы? Як злавіць гэтых тэлефонных «піратаў»,— запытаўся дэкан філалагічнага факультэта Аляксей Арсенцьевіч Волк.

Абурэнне ў голасе члены камітэта народнага кантролю яму даравалі. Хацелася б толькі даведацца, ці кранулася з месца справа па выяўленню «піратаў» пасля нашай размовы.

Тым часам услед за словамі ў тэлефонную трубку цякуць грошы. Дзяржаўныя грошы. Таму што з усіх парушальнікаў выплацілі за размовы толькі студэнт з інтэрната № 5 і супрацоўнікі радыёстанцыі (тры рублі замест трынаццаці). Якія яшчэ вынікі? Гавораць, рыхтуе грошы адзін з супрацоўнікаў гаража, ліквідавалі тэлефонны апарат у прафесарскай геафака.

На гэтым кола замыкаецца. Пачынаецца новы віток. Таму што і новы загад пытанняў не вырашыў.

— Нават не ведаю, чым вам дапамагчы,— пачуўся ў трубцы разгублены голас начальніка аддзела па разліку з кліентурай міжгародняй аўтаматычнай тэлефоннай станцыі В. В. Мальцавай.— На маю думку, сумленне — адзіны фактар, што дапамагае ў гэтай барацьбе.

Дазвольце дадаць: яшчэ кантроль і строгі ўлік. Пакуль сумленне маўчыць, не абысціся без адказных за вядзенне міжгародніх тэлефонных перагавораў і ўдасканалення кантролю.

З. МАРАВА.

## Аўчынка вырабу варта?

У КАНЦЫ красавіка Латвійскі дзяржаўны універсітэт імя П. Стучкі (г. Рыга) правёў школу-семінар маладых вучоных. У рабоце семінара прынялі ўдзел прадстаўнікі Ленінградскага, Вільнюскага, Беларускага універсітэтаў, а таксама шэрагу інстытутаў АН Латвійскай ССР. У праграме — лекцыі па актуальных праблемах экалогіі, гісторыі, філасофіі, права, прачытаныя вядучымі спецыялістамі Латвійскага універсітэта. У час правядзення семінара былі абмеркаваны формы і метады работы саветаў маладых вучоных і спецыялістаў, а таксама пытанні супрацоўніцтва паміж імі.

НА СЕМІНАРЫ высветлілася, што ў рабоце савета маладых вучоных і спецыялістаў ёсць шмат праблем. Перш за ўсё гэта арганізацыя абмену вопытам навуковай моладзі як унутры горада, так і ва ўсесаюзным маштабе, удзел у рабоце НТТМ, шляхі павышэння навуковай аддачы маладых вучоных і вырашэнне сацыяльных пытанняў, звязаных з іх бытам і адпачынкам. Узельнікі семінара прыйшлі да вываду, што актыўная работа савета ў спалучэнні з энергіяй, энтузіязмам і мэтанакіраванасцю маладых вучоных неабходна для хутчэйшага развіцця прыярытэтных напрамкаў сучаснай навукі. Акрамя таго, яны могуць аказаць вялікую дапамогу ў станаўленні маладых вучоных, раскрыцці іх патэнцыялу ў навукова-пазнавальнай і навукова-даследчай рабоце.

На жаль, наш універсітэт не мае вопыту правядзення такіх мерапрыемстваў. Думаецца, нягледзячы на некаторыя фінансавыя затраты, яны прынеслі б шмат карысці як з пункту гледжання устанаўлення навуковых кантактаў, абмену вопытам паміж маладымі вучонымі, так і з мэтай каардынацыі дзейнасці падобных саветаў рэспублікі.

І. ГАНЧАРОНАК.
А. ЦІМАШЭНКА.

ТЫ МЯРКУЕШ, Я МЯРКУЮ

# У камандзіры не пайду

*«Свежым хлебам будзем мы вас сустракаць.*
*Каб у дарозе дальняй вам не сніўся дом,*
*Няхай хлеб сагрэе веснавым цяплом,*
*Мы жадаем шчасця вам...»*

Як бы хацелася, каб усім байцам і камандзірам студэнцкіх атрадаў складалі ў гонар прыезду на месца працы такія прывабныя сваёй шчырасцю радкі! Не буду замоўчваць, каму яны адрасаваны: будаўнічаму атраду «Кастрычнік» гістарычнага факультэта.

Таму іменна Аляксандра Ходзікава, камандзіра са стажам, я папрасіла падзяліцца вопытам:

— Ад камандзіра залежала арганізацыйная работа, уменне своечасова заўважыць і адрэагаваць на думку калектыву, хаця ў нейкай ступені і агітбрыгада, і выпуск насценнай газеты адлюстроўваюць яе.

На нашы выступленні збіралася амаль уся моладзь з навакольных вёсак.

Вось адно меркаванне аб камандзірскай дзейнасці. Згадзіцца з ім?

— Агітбрыгада, насценгазета? Дарэмна. Мы ж едзем, каб працаваць. Можа, у нас гэта адзіная магчымасць не вісець, як кажуць, на шыі ў бацькоў,— суб'ектыўная думка юрыстаў, у мінулым байцоў атрада «Віцязь», які таксама працаваў у Іркуцкай вобласці.— Існуюць так званыя агітцягнікі, яны і павінны весяліць мясцовае насельніцтва. У першую чаргу — добрая праца, станоўчы лад жыцця, што, безумоўна, залежыць ад прынцыповасці камандзіра. Мы за тое, каб камандзір і дзелавы чалавек былі ў адной асобе. Мы — за поўную загружанасць працай, за актыўны адпачынак на свежым паветры, а не з алоўкам у руках, калі гэта справа для «птушкі».

У пэўных абставінах камандзір павінен вычэрпваць усю меру строгасці. Яму быць дыпламатам, вызначаць стратэгію і тактыку свайго атрада, мабыць, тады не будуць прыязджаць «госці» з занальнага штаба і прызначаць іншае кіраўніцтва для байцоў.

— Тады я ў камандзіры не пайду,— робіць вывады чытач.— Складана.

А можа ёсць над чым падумаць? І ўспрыняць гэтыя словы як заклік да будучых камандзіраў, камісараў і радавых байцоў.

Чаму гучаць такія словы? І наогул, на ваш погляд, хто ён, сённяшні камандзір: дзялец, дыпламат, арганізатар ці першы адрасат цёплых віншаванняў і сустрэч?

Працягнем размову ў рубрыцы «У камандзіры не пайду».

Э. САЕВІЧ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

ТЫСЯЧА І АДЗІН РЭЦЭПТ АДПАЧЫНКУ

# На хімфаку — свята

У ЗАЛЕ паступова ўсталёўвалася цішыня: займалі свае месцы тыя, хто спазніўся, старыя знаёмыя, што сустрэліся пасля доўгай разлукі, на некаторы час пакінулі ажыўленыя размовы. І вось ужо песня, што ледзь чутна даносілася недзе з-за сцэны, запоўніла вялікую залу Дома настаўніка. Выкладчыкі, студэнты-хімікі, усе прысутныя заціхлі ў чаканні прадстаўлення.

Шаснаццаты раз дзень хіміка прымае гасцей і віншаванні. Свята працягваецца, а пачалося яно на хімічным факультэце БДУ. Тут мастакі, як заўсёды, так пастараліся, што калідоры і холы было не пазнаць, а многія госці жартавалі: «Каго тут больш: хімікаў ці мастакоў?». У праграме Дзён — ужо стаўшая традыцыйнай канферэнцыя з выкладчыкамі, якая заўсёды збірае шмат аматараў задаць каверзнае пытанне, кірмаш, аўкцыён, а ў перапынках паміж заняткамі — музыка і тэлевізійнае шоу.

Але самае галоўнае і цікавае адбывалася ў Доме настаўніка. Рытм-група «Капрыз», рок-група «Акварыумныя рыбкі», МХАТ (мясцовы хіміка-аналітычны тэатр) — усё гэта добра вядомыя калектывы мясцовых талентаў, якія стараліся, як маглі, каб у зале не было ніводнага засмучанага твару.

Шаснаццаць гадоў — сур'ёзны ўзрост. Самы хвалюючы момант яго — уручэнне пашпарта. Перажыў яго ў гэты дзень і Максім Чуль — галоўны каардынатар шаснаццатых Дзён хіміка.

У пачатку вечара быў падпісаны дагавор паміж дэканатам і студэнтамі першага курса аб узаемнай павазе і ненападзенні, потым была прамова дэкана факультэта В. Ф. Цікавага. Патрэбна сказаць, што яна на працягу многіх гадоў з'яўляецца сувязным звяном паміж афіцыйнай і неафіцыйнай часткамі ўрачыстасці і заўсёды суправаджаецца ўзрывамі смеху і бурнымі апладысментамі. Вадзім Фёдаравіч ніколі не паўтараецца, стараецца, каб выступленне было актуальным і надзённым.

Нарэшце афіцыйная частка закончана, і вядучыя запрашаюць прысутных паглядзець інфармацыйна-музычную праграму «Уздых». Жадаючы быць падобнымі па працягласці прамога эфіру на аналагічныя праграмы Цэнтральнага тэлебачання, «Уздых» пачаў сваю работу з размінкі. Салісты рок-групы «Капрыз» зноў парадавалі гледачоў чароўнай пластыкай і грацыёзнасцю. У сувязі з надыходзячымі Алімпійскімі гульнямі значнае месца ў праграме было аддадзена спорту: шахматам, цяжкай атлетыцы...

Сюжэты змянялі адзін аднаго, студэнты пазнавалі выкладчыкаў, жыва рэагуючы на знаёмыя жэсты, фразы, манеры паводзін, выкладчыкі з цяжкасцю пазнавалі ў артыстах сваіх вучняў і доўга апладзіравалі ім.

...Час прадстаўлення прайшоў. Занавес закрываецца, свята закончылася, каб праз год зноў радаваць сваіх сяброў жартамі, гумарам і талентамі.

Т. ЗАГНІЙ,
студэнтка хімічнага факультэта.

МАЛАДЫ СПЕЦЫЯЛІСТ: ЯК СПРАВЫ?

# Адказнасць быць настаўнікам

**Іван Герасімовіч і Сяргей Чыгрын — маладыя настаўнікі, нядаўнія выпускнікі філалагічнага факультэта. Па размеркаванню яны паехалі працаваць у родныя мясціны, дзе іх чакалі будучыя вучні, з маленства бясконца дарагія людзі — бацькі і землякі. І. Герасімовіч другі год працуе ў Чыжахскай васьмігадовай школе Бярэзінскага раёна. Для С. Чыгрына, настаўніка Глоўсевіцкай сярэдняй школы Слонімскага раёна, сёлета пачаўся трэці год самастойнай працы. Працуюць учарашнія выпускнікі творча, з натхненнем. Аб гэтым і сведчыць гутарка з імі пра школьныя справы, пра тое, што паспела накіпець у душы і хвалюе ў дні перабудовы сярэдняй і вышэйшай школы.**



*— Сам час, новыя партыйныя дакументы аб школе ўносяць у навучальны і выхаваўчы працэс шматлікія карэктывы, заклікаюць да актывізацыі творчай думкі. Як вы асабіста адчуваеце рытм сённяшняга дня і якія, на ваш погляд, пытанні паўстаюць перад школай надзвычай востра?*

**Іван ГЕРАСІМОВІЧ:** Працоўны стаж невялікі, але ўжо паспеў адчуць і радасць поспеху, і горыч няўдач. Бадай, інакш і не можа быць. Без памылак, засмучэнняў, бесперапыннага пошуку не было б руху наперад, не было б шчаслівых хвілін творчага задавальнення. Кожная няўдача прымушае падумаць, азірнуцца, шукаць прычыну зрыву, уласнай памылкі і знаходзіць нейкі іншы метад, дзейсны прыём ці варыянт. А поспех — тая саломіна, за якую хапаешся. Нараджаецца ідэя, яе развіваеш, ідзеш сам і вядзеш за сабой дзяцей.

Праблем жа існуе нямала. Нярэдка школе не хапае калектыўнага пачатку. Дрэнна, калі дырэктар выстаўляе сваё «превосходство», дыктуючы ўласную волю. Не на карысць агульнай справе грэблівае стаўленне да думкі маладога настаўніка. У студэнцкія гады імкнуўся глыбока вывучыць вопыт арганізацыі дзіцячага калектыву А. С. Макаранкі. І зараз працягваю, з'яўляюся прыхільнікам ідэй выдатнага педагога. Яны сталі маімі перакананнямі, бо вопыт Макаранкі — класічны. Толькі трэба напоўніць гэтыя прынцыпы арганізацыі калектыву сучасным зместам. І поспех тут забяспечаны.

**Сяргей ЧЫГРЫН:** У першыя дні адчуваў сябе ў школе, як дэсант на чужой зямлі. Але побач былі добразычлівыя, шчырыя калегі, якія здорава дапамаглі. Сёння школа — родная стыхія, у іншым святле бачыцца многае.

Не сакрэт, што асобныя настаўнікі, асабліва маладыя, маюць неглыбокую метадычную падрыхтоўку, недастаткова рэалізуюць адукацыйныя і выхаваўчыя магчымасці ўдасканаленых праграм. Добра, што ў школу прыходзяць маладыя настаўнікі, бо каго ж было б крытыкаваць. Паспрабуй, скажы настаўніцы з дзесяці- ці дваццацігадовым педстажам, што яна дрэнна працуе, то зведаеш, па чым фунт ліха. І жыцця табе ў школе не стане. Хваравіта ўспрымаючы крытыку, гэта настаўніца да сённяшняга дня без «талмуда» не можа на прыкладах паказаць, што збліжае Цётку з Багушэвічам і чым адрозніваецца яе паэзія ад творчасці Багушэвіча, ці абгрунтаваць думку, што біяграфія Янкі Купалы — неад'емная частка жыцця беларускага народа, яго працы і барацьбы.

Вядома, што ў рэспубліцы для настаўнікаў-беларусазнаўцаў не хапае метадычнай літаратуры. Настаўнік-філолаг павінен быць аўтарам сваёй вуснай распрацоўкі ўрока пры вывучэнні пэўнай тэмы або, калі выпадае, весці размову пра новы твор ці літаратурную з'яву. Настаўнік-філолаг — гэта крытык, гісторык, літаратуразнаўца, мовазнаўца і трохі паэт. Тады і вучні будуць імкнуцца выказваць свае думкі, прыводзіць уласныя прыклады, назіранні, яны абавязкова павядуць з табой шчыры дыялог.

**І. Г.:** Вельмі слушна сказана. Дзецям надакучыў шаблон. «Прэч са школы акадэмічнасць!» — гэта патрабаванне вучняў. Больш ім трэба самастойнасці і адказнасці даць. У восьмым класе мы, напрыклад, падручнікам амаль не карыстаемся. Вучні прывыклі, хоць і не адразу, да маіх параўнанняў-выхадаў у зарубежную літаратуру. Прыемна бачыць, калі за тваімі разважаннямі і каментарыямі яны нешта сталі запісваць. Іду ў гэты клас як на свята.

**С. Ч.:** У сваіх старэйшых класах часта чую абурэнне: «А нас так не вучылі, раней мы расказвалі ўсё, што напісана ў падручніку». Думаецца, неабходна заўсёды помніць, што закасцянеласць, стэрэатыпнасць мыслення — страшная рэч. А. Барбюс пісаў: «Школа — гэта майстэрня, дзе фарміруецца думка падрастаючага пакалення, трэба моцна трымаць яе ў руках, калі не хочаш выпусціць з рук будучае».

*— Вы абодва — класныя кіраўнікі...*

**С. Ч.:** Так, гэта адказны ўчастак работы. І цяжкасцей тут хапае, асабліва калі цябе «узнагародзілі» старэйшым класам з надзеяй на тое, што ты малады, табе пад сілу з ім справіцца. Часам паўстае пытанне: «А што рабілі ў гэтым класе мае папярэднікі?» Многае ў выхаванні ўжо запушчана, вельмі цяжка знайсці да кожнага падыход, выклікаць давер вучня. Ці не мэтазгодным будзе тое, каб маладых настаўнікаў у першы год іх педагагічнай дзейнасці не нагружаць класным кіраўніцтвам, а даць магчымасць пазнаёміцца са школай, з вучнямі, з той атмасферай, якая існуе ў калектыве. І толькі на наступны год даверыць класнае кіраўніцтва ў чацвёртым ці пятым класе, але толькі не ў старэйшых.

**І. Г.:** Асабліва адчуваю цяжкасці ў планаванні і арганізацыі класных гадзін. Іншы раз бываю імі незадаволены. Напэўна, многія складанасці ад таго, што з'яўляюся на падмене: прыняў сёмы клас. Цяжка дзецям і мне, бо яны прывыклі да былога свайго кіраўніка. На вопыце пераканаўся, што трэба браць малодшы клас і весці яго да выпуску. І мая мара — стаць класным кіраўніком чацвёртакласнікаў.

*— На чым бы вы ў большай ступені акцэнтавалі сваю ўвагу, калі б зноў апынуліся ў студэнцкай аўдыторыі?*

**І. Г.:** Каб быў зноў студэнтам, больш звяртаў бы ўвагі на дзіцячую літаратуру. У гэтым плане я «не дабраў». Цяпер заўважыў, як дзеці любяць калектыўнае чытанне, як загараюцца ў іх вочы, калі чытаеш казкі Я. Коласа, В. Віткі, А. Пысіна. Таму адкрываю новае для сябе, чытаю і радуюся разам з дзецьмі. І шчаслівая тая хвіліна, калі дзеці просяць пачытаць. Разумею цяпер і падтрымліваю думку пісьменніка А. Дударава — як можна больш чытаць з дзецьмі, каб дапамагчы ім адчуць прыгажосць і сілу мастацкага слова.

Неяк аднойчы пасля чытання з'явілася ідэя складаць з вучнямі вершы. І ёсць вынікі: ад бурымэ і акравершаў прыйшлі мы да трыялета. І не так важны тут вынік, як сам працэс творчасці, які развівае і мову, і памяць, і мысленне. Нарэшце, ўзвышае.

**С. Ч.:** Па-першае, хацелася б, каб педпрактыка ва універсітэце была больш мэтанакіраванай, не насіла на малодшых курсах фармальны, эпізадычны характар. Хіба няма магчымасці наладзіць практыку студэнтаў так, каб, заканчваючы універсітэт, яны маглі, напрыклад, выпусціць свой першы клас? Па-другое, значна глыбей вывучаў бы вопыт педагогаў-наватараў, пытанні школазнаўства і методыкі выкладання. Мабыць, тады не ўзнікла б памылковае меркаванне, што студэнты педінстытута для практычнай дзейнасці лепш падрыхтаваны, чым студэнты універсітэта.

*— Вядома, што нават у школах з беларускай мовай навучання існуе моўная праблема...*

**С. Ч.:** Проста недаравальна, што многія настаўнікі ў сельскай школе вядуць свой прадмет на рускай мове. Над гэтай праблемай варта сур'ёзна задумацца і гісторыку, і біёлагу, і матэматыку ўжо ў студэнцкія гады.

Думаецца, у першым класе вучні ў належнай ступені не авалодалі беларускай мовай, у іх зусім недастаткова ўменняў, каб ужо ў наступным годзе прыступіць да вывучэння рускай. У чацвёртым класе вучні блытаюцца, адказваючы на ўроках на дзвюх мовах. Да таго ж чацвёртакласнікі пачынаюць вывучаць замежную.

**І. Г.:** Хочацца, каб праца настаўніка не была так абюракрачана. Колькі лішняй пісаніны: выпісванне картак для тэматычных папак, выпісванне тэкстаў, на ўсё патрэбен план. Я не кажу пра рабочыя планы ўрокаў — гэта рэч неабходная. Чамусьці лічыцца, калі кабінет прыгожа аформлены, шмат папак і каробак — настаўнік працуе добра. А гэтыя папкі ды каробкі не заўсёды прыносяць карысць. Нярэдка проста пустая трата часу. А настаўніку патрэбен час для самаадукацыі.

**С. Ч.:** Мне, як маладому педагогу, хочацца бачыць і такія школы, у якіх працавалі б і адкрывалі новае толькі маладыя — нядаўнія выпускнікі педвучылішчаў, ВНУ. Я веру ў такія школы, у сваіх равеснікаў-калег. Маладосць — вялікая стваральная сіла. Думаючы пра ролю маладога настаўніцтва, згадваю ленінскія словы: «Саюз камуністычнай моладзі павінен быць ударнай групай, якая ў кожнай рабоце аказвае сваю дапамогу, праяўляе ініцыятыву, свой пачын».

З настаўнікамі гутарыў
А. БЕЛЬСКІ,
аспірант кафедры беларускай літаратуры.

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

# НЕ ПРАДСТАЎЛЯЕЦЦА...

У АДКАЗ на артыкул «Часовая прапіска» («Беларускі універсітэт», 31 сакавіка 1988 года) аб лёсе заалагічнага музея пры біялагічным факультэце універсітэта паведамляем, што перамяшчэнне музея адбылося вымушана, таму што памяшканне, якое ён займаў раней, прызначалася і спецыяльна праектавалася пры будаўніцтве вучэбнага корпуса для размяшчэння ЭВМ. Зараз вядзецца падрыхтоўчая работа ў гэтым памяшканні для абсталявання яго вентыляцыяй, гукапаглынальным пакрыццём і зазямленнем, што неабходна зрабіць да устаноўкі ЭВМ.

Выкарыстанне вылічальных машын у вучэбным працэсе, у навуковых даследаваннях абодвух факультэтаў, размешчаных сёння ў філіяле БДУ, з'яўляецца вельмі неабходным.

Выдзеліць якое-небудзь іншае больш падыходзячае памяшканне на плошчах універсітэта для музея сёння не прадстаўляецца магчымым.

У праекце вучэбнага корпуса біялагічнага факультэта, пачатак будаўніцтва якога запланаваны на гэты год, прадугледжана спецыяльна абсталяваная прыбудова для размяшчэння музея.

У. ІВАШЫН,
прарэктар па вучэбнай рабоце, прафесар.

# «Імгненне, ты цудоўнае!..»

ЯК ЦУДОЎНА, што мы жывём у свеце, дзе кожны новы дзень адбываюцца новыя падзеі, дзе час пазірае ў аб'ектыў, каб пакінуць сляды сваіх імгненняў на старонках газет і часопісаў.

Пагадзіцеся, сёння фотааб'ектыў стаў мікраскопам, які дапамагае пільна і ўважліва прыглядзецца да ўсяго навокал. Фотакамера адмервае час не на хвіліны, не на гадзіны, а на долі секунды. З такіх стоп-кадраў і складваецца стужка жыцця...

Сярод многіх жанраў мой самы любімы — партрэт. Думаю, што іменна фатаграфія найбольш глыбока выяўляе ўнутраны свет чалавека. Твары людзей — люстэрка жыцця. Самыя чыстыя і праўдзівыя. Убачыць у іх «след душы» — значыць спыніць тое адзінае імгненне, калі выяўляецца самае галоўнае, патаемнае і характэрнае ў чалавечай асобе. Гэта доля секунды і становіцца шчырым расказам героя здымка «пра час і пра сябе».

«Спыніся, імгненне, ты цудоўнае»,— трапна адзначыў паэт, не маючы, вядома, на ўвазе фотасправу. Але гэтыя крылатыя словы сталі сапраўдным дэвізам майстроў і аматараў фатаграфіі многіх пакаленняў.

Сёння фотаапарат бяром у рукі мы. Уважліва ўзіраемся ў самыя розныя праявы нашага жыцця, ловім аб'ектывам цікавыя кадры і... «спыніся, імгненне!».

А. ШАБАЛІНА.

# Цікавае стварaем самі

ЦЯПЕР, калі думаю: усяго гэтага магло не быць, становіцца неяк няёмка, што, калі б не выпадковыя абставіны, я так і не навучылася б трымаць у руках фотаапарат.

Вядуцца на факультэце заняткі па фотасправе, дзе я заўсёды імкнулася ўважліва слухаць тлумачэнні выкладчыка. Але калі справа даходзіла да практыкі... Баялася нават нешта павярнуць у сваім новенькім «Зяніце». А спытаць таксама сорамна: таварышы вунь ужо якія здымкі робяць, у газетах друкуюцца. Так і старалася неяк працягнуць час ад заняткаў да заняткаў.

І вось аднойчы зусім нечакана давялося звярнуцца да свайго фотаапарата за дапамогай. Ён з'явіўся для мяне своеасаблівым пропускам на спаборніцтвы па «паляванню на ліс». Усё атрымалася неяк само сабой. Не ведаю, адкуль узялася ўпэўненасць, што раблю ўсё правільна, адкуль узяліся навыкі. Відаць, лекцыі ўсё ж не прайшлі дарэмна. Калі глядзела ў аб'ектыў, здавалася, што ўсе моманты варты таго, каб іх сфатаграфавалі. Нават кадры не паспявала пераводзіць. А потым амаль тыдзень чаравала над плёнкай: хацелася, каб, глянуўшы на мае здымкі, чалавек адчуў тое ж, што адчувала я, робячы іх.

Л. ЦІМОШЫК.

## ДАЗВОЛЬЦЕ ПРАДСТАВІЦЬ

Здаецца, апраўдаць надзей тых, хто сустрэў нас словамі: «І што ж вы там купілі?», у нас не атрымаецца. Набылі толькі шмат уражанняў. Напэўна, тым і адрознівалася наша падарожжа ў Талін і Рыгу, што ў цэнтры ўвагі былі зусім не магазіны, як часта, на жаль, бывае, а людзі і, зразумела, архітэктура.

За тры дні ўбачыць нешта ў гарадах, чыя гісторыя налічвае дзесяткі стагоддзяў. Ці магчыма такое? Мы адказваем сцвярджальна. Справа ж не ў тым, колькі прайшлі кіламетраў па маставых, колькі выпілі кубкаў кавы. Галоўнае, зазірнулі ў старадаўняе, адчулі прыгажосць і хараство яго.

Яшчэ на чыгуначным вакзале Рыга акінула нас паблажлівым позіркам з вышыні хараства архітэктурных ансамбляў, прыгажосці кветкавых базараў, сырога подыху Балтыкі. Магчыма, таму Талін спачатку здаўся не такім прыцягальным. Праўда, гэта было да таго часу, пакуль мы не ўбачылі знакамітых чарапічных дахаў, не прайшліся па вузенькіх (дзе там сучаснаму руху, калі шырыня іх — 2 метры) вулачках, не заглянулі ў самую старую аптэку, не пабывалі на Пеўчым полі...

Добра, што не забылі фотаапараты, зараз непаўторнасцю гэтых гарадоў можаце палюбавацца і вы. Магчыма, дзякуючы нашаму фотарэпартажу, пакліча чыё-небудзь сэрца прыгажуня Рыга ці мудры старажытны Талін.

Н. ГАЛАЎНІЦКАЯ.

# Першы блін

З ПЕРШЫХ ДЗЁН заняткаў захапіўся фатаграфіяй і шмат часу праводзіў у лабараторыі. Паявіліся некаторыя навыкі, штосьці пачало атрымлівацца. Захацелася паспрабаваць сябе ў больш сур'ёзнай справе — зрабіць здымкі для газеты. Выкладчыца Т. Я. Хаміцэвіч прапанавала шматтыражную газету «На стройках Минска». Згадзіўся і пайшоў...

Заданне было зрабіць фотарэпартаж аб камсамольска-маладзёжнай брыгадзе Січаева, якая працавала на будаўніцтве рэспубліканскага Палаца культуры. Вельмі хацелася сваё першае даручэнне выканаць як мага лепш, таму я зайшоў у кватэру дома насупраць, каб сфатаграфаваць агульны выгляд аб'екта. Памятаю здзіўленыя вочы гаспадароў кватэры, калі яны пачулі маю просьбу. Брыгада Січаева працавала на самай верхатуры, нават страшна было глядзець уніз. Але паступова страх адыходзіў, калі я глядзеў на ўпэўненыя крокі рабочых, іх працу.

Як я радаваўся, калі праз тыдзень былі надрукаваны мае першыя фотаздымкі! І першы блін, на шчасце, атрымаўся не комам.

А. ЮНЧЫК.

«Навучыцца бачыць». Што цудоўнае, а што нязграбнае. Апынуліся побач святло і цень. А чалавек павярнуўся да сонца і выгукнуў: «Я хачу бачыць святло!» Хто ён? Паэт? Музыкант? Мастак? А магчыма, стомлены падарожнік».

Для членаў фотагуртка «Плэнэр» (менавіта аб ім папярэднімі словамі і пачыналася гаворка) гэта вельмі важна. Яны вучацца.

Бліскучы «Зеніт», рознакаляровыя скрыначкі стужак. Усяго гэтага багацця дастаткова, каб стаць «фіксатарам» падзей. А калі для некага недастаткова? Далей — складаней. Трэба ўмець адчуваць святло, «вытрымліваць» час. За «пару», нават дзве, складана ўсё паспець. У час заняткаў нельга наведаць музей ці выстаўку. Не праводзяць іх і на катку. Да таго ж, у лабараторыі не заўсёды высветліш, хто не зразумеў чагосьці, каму патрэбна дапамога. Выручае гурток.

Індывідуальнай работай са студэнтамі называюць гэту справу салідныя людзі, а ўдзельнікам яе проста падабаецца, што нарэшце з'явілася магчымасць ажыццяўляць уласныя ідэі. Спачатку нараджаліся яны толькі ў галаве кіраўніка — выкладчыцы Тамары Якаўлеўны Хаміцэвіч. Потым, напрыклад, апошняе падарожжа ў Талін і Рыгу было прапанавана самімі студэнтамі.

# Зоркі фатаграфіі

ЯКІ нялёгкі гэты шлях да сустрэчы з фатаграфіяй.

З якой дзіцячай радасцю заўважаеш, як на звычайнай паперы з'яўляецца відарыс, з якімі цяжкасцямі «ловіш» цікавыя, патрэбныя моманты. А рукі, калі першы раз запраўляеш плёнку ў касету? Нязграбныя, вялікія, непаслухмяныя, быццам не свае. А розныя недарэчныя выпадкі, што адбываюцца ў жыцці пачынаючых?

Давялося мне аднойчы здымаць з фотаўспышкай. Вядома, паўстала пытанне: як жа дзейнічаць? А мне адказваюць: «Загарыцца чырвоная лямпачка — успышка зарадзілася. Хутчэй выключай яе з разеткі, а то ўзарвецца». Зараз смешна, а тады паверыла: загарыцца лямпачка — выключаю. Як бы чаго не атрымалася!

Дарэчы, да універсітэта я фотаапарат нават не трымала ў руках, не ведала, як фатаграфаваць, як праяўляць плёнкі, рабіць здымкі. Таму ўсё для мяне было нечаканым, таямнічым, нязведаным.

Як жа хочацца хутчэй пераадолець той складаны, цярністы шлях — шлях да зорак Краіны Фатаграфіі, каб жыццё навокал павінавалася табе.

Л. ПРАЎЛОЦКАЯ.











# Фотаапарат, цвік і свята

СЮДЫ я забегла зусім выпадкова: проста на вуліцы ішоў дождж. Людзі, падняўшы каўняры, адгарадзіўшыся ад усяго свету парасонамі, праходзілі міма маленькай афішы, якая сціпла запрашала ўсіх жадаючых у невялікі павільён на фотавыстаўку малавядомага фатографа. Жадаючых было мала, ды і сама афіша, напісаная ад рукі, добрай рэкламы не стварала. Але ўсё ж я зайшла.

...Вам знаёма хваляванне вяснушкаватай першакласніцы, ледзь заўважнае з-пад велізарнага букета? А спатканне пад гадзіннікам ці ля помніка паэту? Сівая маці, праводзячы вас у дарогу, ці не гэтак доўга і напружана глядзіць услед, як гэта незнаёмая жанчына?

Першай маёй думкай было, што недзе я ўжо гэта бачыла.

Прызнайцеся шчыра, колькі раз вы заўважалі што-небудзь незвычайнае і шкадавалі, што няма з сабою фотаапарата. І колькі такіх дзіўных імгненняў прайшло міма. Пакідаючы выстаўку, я гаварыла сабе: займуся фатаграфіяй усур'ёз. Праходзіў час, паяўляліся другія справы, а фотаапарат вісеў на цвіку. Але што цікава: патрэбна толькі пачаць займацца фатаграфіяй і на доўгі час гэту справу кінуць нельга. І вось зноў зараджаецца плёнка ў касету, фотаапарат на плячы, і ты ідзеш па вуліцах, імкнучыся заўважаць усё самае-самае, і радуешся, што на гэты раз трапны кадр не будзе ўпушчаны. Мне здаецца, што адна з адметных асаблівасцей чалавека, які ўмее фатаграфаваць,— гэта тое «свята, якое заўсёды з табою».

А. КРУПЕНЬКА.

